УДК 726.593(476)

Галіна Флікоп-Світа

# Асаблівасці ансамбля іканастасаў і бакавых алтароў у беларускіх уніяцкіх храмах Кіеўскай архіепархіі ў XVII - першай трэці XIX ст.

**Галіна Флікоп-Світа**

**Особливості ансамблю іконостасів та бічних вівтарів у білоруських уніатських храмах Київської архієпархії в XVII - перша третина XIX ст.**

Досліджуються інтер'єри уніатських церков Білорусі та Підляшшя, які в XVII–XVIII ст. входили до складу Київської митрополичої єпархії. Ця єпархія в зазначений період була найбільшою: з білоруських територій вона охоплювала Мінське, Новогрудське, Віленське і Троцьке воєводства (в Україні – Київське і Брацлавське). Простежується в хронологічній ретроспективі процес трансформації інтер'єрів від східнохристиянського до західнохристиянського типу. Обґрунтовано, що це проявилося, насамперед, в розірванні іконостасів і появі пристінних вівтарів (а також і інших атрибутів латинського обряду). У низці храмів спостерігалося одночасне поєднання сакральних об'єктів, які належали до різних традицій. А також в один і той же проміжок часу існували церкви, оформлені і на грецький, і на латинський лад, і "синтезовані" в обох стилях. Дослідження проведено на основі протоколів перевірок уніатських церков (візитів), найбільш ранні з яких у цій єпархії належать до 1680 р., найбільш пізні – до1830 р.

*Ключові слова:* уніатська церква, Київська уніатська єпархія, іконостас, вівтар, церковний інтер'єр

**Halina Flikop-Svita**

**The characteristics of the ensemble of iconostases and side altars in the Belarusian Uniate temples of the Kiev Archdiocese in the 17th – first third of the 19th centuries.**

The interiors of the Uniate Churches of Belarus and Podlachia, which in the $17^{th}$ – $18^{th}$ centuries were part of the Kyiv Metropolitan diocese, are studied. This diocese during the specified period was the biggest one: with Belarusian territory it covered Minsk, Nowogródek, Vilnius and Trakai Voivodeships (in Ukraine - Kyiv and Bracław). The process of transformation of interiors from the East-Christian

to the Western-Christian type is chronologically traced. It is substantiated that this manifested itself first of all in the termination of the iconostasis and the appearance of wall altars (and other attributes of the Latin rite). In some churches there was a simultaneous combination of sacred objects which belonged to different traditions. And also in the same time period there were churches decorated in Greek way, Latin way and "synthesis" of both styles. The study was conducted on the basis of audit protocols of Uniate churches (visits), the earliest of which in this diocese belong to 1680, the most recent – to 1830.

*Keywords:* Uniate Church, Uniate Diocese of Kyiv, iconostasis, altar, church interior

У гісторыі ўніяцкай царквы адным з цікавых і слаба даследаваных пытанняў з'яўляецца трансфармацыя царкоўных інтэр'ераў на працягу існавання канфесіі. Натуральна, што вывучэнне акрэсленай праблемы магчыма праводзіць толькі на аснове гістарычных дакументаў, бо пры падрыхтроўцы да скасавання Уніі, што адбылося на беларускай тэрыторыі на Полацкім царкоўным саборы ў 1839 г., унутранае царкоўнае аблічча было прыведзена ў адпаведнасць з патрэбамі і канонамі ўсходняга хрысціянства.

На першым этапе існавання Уніі інтэр'еры захоўвалі свой выгляд, які быў сфарміраваны паводле праваслаўных традыцый. Паступова пад уплывам каталіцтва ў храмах разглядаемай канфесіі пачалі адбывацца працэсы лацінізацыі, што праявілася ў розных рэгіёнах па-рознаму, з рознай інтэнсіўнасцю і набыло розныя формы. Вывучэнне асаблівасцяў абсталявання храмавых інтэр'ераў уяўляе навуковую цікавасць, бо атрыманыя звесткі могуць пасадзейнічаць у высвятленні розных пытанняў гісторыі культуры. Напрыклад, яны адлюстроўваюць тагачаснае стаўленне святароў, вернікаў і калятараў храмаў да праваслаўнай і каталіцкай веры, бо пры сімпатыях да першай ва ўніяцкіх цэрквах працягвалі захоўвацца іканастасы, а пры імкненні зблізіцца з другой іканастасы знікалі, саступаючы месцы прысценным алтарам.

Актуальнасць вывучэння асаблівасцяў абсталявання царкоўных інтэр'ераў тлумачыцца тым, што менавіта ўнутраная храмавая прастора была візуальным адлюстраваннем таго, па якім абрадзе

адбывалася набажэнства ва ўніяцкім храме. А гэта ў сваю чаргу ўплывала на культуру прыхаджан уцэлым, бо іх лад жыцця ў значнай ступені залежаў ад рэлігійных традыцый. Акрамя таго, наяўнасць або адсутнасць іканастасаў і прысценных алтароў уплывала на тое, якія сюжэты ікон былі больш запатрабаванымі ва ўніяцтве, а попыт, як вядома, спараджае прапанову: гэта магло пасадзейнічаць больш творчай актыўнасці пэўных майстроў або іканапісных асяродкаў.

Хоць тэма нам і бачыцца цікавай і запатрабаванай, аднак па аб'ектыўных прычынах яна доўгі час заставалася па-за ўвагай навукоўцаў. Гэта тлумачыцца тым, што яе магчыма распрацоўваць толькі пры прыцягненні вялікага кола крыніц. Складанасць тут уяўляе тая акалічнасць, што, каб ахапіць максімальна ўсе рэгіёны, неабходна ажыццяўляць пошук дакументаў у архівах не толькі Беларусі, але і замежжа, што, натуральна, ускладняе работу.

З даследчыкаў, якія звярталіся да пытанняў абсталявання інтэр'ераў уніяцкіх храмаў Беларусі, можна прыгадаць беларускага мастацтвазнаўцу А. А. Ярашэвіча [1] і польскага гісторыка П. Сігоўскага [2]. Першы з названых у абагульненай форме выказаў слушныя назіранні адносна магчымага варыянту абсталявання ўніяцкіх цэркваў, а другі падрабязна на аснове архіўных дакументаў з Люблінскага дзяржаўнага гістарычнага архіва засяродзіўся на рэгіянальных асаблівасцях абсталявання інтэр'ераў цэркваў Брэсцкага афіцыялату Уладзіміра-Брэсцкай епархіі за 1725–1727 гг. і "Польска-Полацкай" епархіі за 1789–1790 гг. [3].

Даследаванню пытанняў наяўнасці ці адсутнасці іканастасаў і бакавых алтароў ва ўніяцкіх цэрквах іншых епархій былі прысвечаны некаторыя з нашых артыкулаў. Так, намі разглядаліся храмы Полацкай епархіі [4], Тураўскага афіцыялату Турава-Пінскай епархіі [5], некалькіх дэканатаў Уладзіміра-Брэсцкай епархіі [6–9]. Праблеме наяўнасці іканастасаў ва ўніяцкіх храмах быў прысвечаны абагульняючы артыкул, у якім ахоплены прыхадскія цэрквы розных рэгіёнаў (і адпаведна, розных епархій) [10]. А дадзеная публікацыя

працягвае гэтую серыю работ і прысвечана цэрквам самай шматстайнай паводле колькасці прыходаў епархіі – Кіеўскай мітрапаліцкай.

З улікам вышэй сказанага адносна актуальнасці і нераспрацаванасці дадзенага праблема поля, **мэта** дадзенага даследавання заключаецца ў тым, каб вызначыць асаблівасці суіснавання іканастасаў і прысценных алтароў ва ўніяцкіх цэрквах Кіеўскай епархіі з тэрыторыі Беларусі (а таксама – Падляшша).

На беларускай тэрыторыі ўніяцкія прыхадскія храмы ў XVII–XVIII ст. ўваходзілі ў склад "Літоўскай" часткі Кіеўскай мітрапаліцкай епархіі (Кіеўская мітрапаліцкая епархія апоплівала цэрквы на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага – так званая "Літоўская" частка, і на тэрыторыі Польскага каралеўства – т.зв. "Каронная частка"), Полацкай архіепархіі, Турава-Пінскай епархіі і Брэсцкага афіцыялату Уладзіміра-Брэсцкай епархіі. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходу беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі ўніяцкая царкоўна-адміністрацыйная структура мянялася некалькі разоў. Напрыканцы існавання Уніі храмы канфесіі на беларускай тэрыторыі адносіліся да двух існуючых на той час епархій – Літоўскай і Беларускай [11, с.106–107].

Кіеўская мітрапаліцкая епархія ў XVII–XVIII ст. была найбольшай: з беларускіх тэрыторый яна ахоплівала Менскае, Навагрудскае, Віленскае і Трокскае ваяводствы (на Украіне – Кіеўскае і Брацлаўскае). Намінальным цэнтрам лічыўся Кіеў, аднак пасля адыходу горада ў 1667 г. да Маскоўскай дзяржавы фактычным цэнтрам з'яўлялася Вільня (мітрапаліты жылі ў Вільні, Навагрудку, а з XVIII ст. яшчэ і ў Варшаве) [11, с. 106], таму ў гістарыяграфіі ўкаранілася найменне для гэтай епархіі "Кіеўска-Віленская", хоць у гістарычных крыніцах яна афіцыйна называлася "Кіеўскай". Пасля ўваходу беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі і са зменай царкоўна-адміністрацыйнай структуры храмы з беларускай тэрыторыі колішняй Кіеўскай епархіі ўвайшлі пераважна ў склад новаўтворанай у 1797 г. Брэсцкай епархіі (у 1795 г. загадам імператрыцы Кацярыны ІІ усе ўніяцкія епархіі, акрамя Полацкай,



*ISSN 2523-4234 Історія релігій в Україні: наук. щорічн., 2018, Вип. 28, Ч. ІІ.*

былі скасаваны), а з 1809 г. паўночная і ўсходняя часткі апошняй (Віленская, Курляндская і частка Мінскай губерні) былі перададзены да заснаванай Віленскай епархіі, на аснове якой у 1828 г. утворана Літоўская епархія. Гомельскі і Рагачоўскі дэканаты былой Кіеўскай епархіі ў 1797 г. былі перададзены да Полацкай, якая ў 1828 г. з далучэннем іншых тэрыторый, у тым ліку і ўсходняй часткі Віленскай епархіі, рэарганізавана ў Беларускаю епархію. Такім чынам, на момант скасавання Уніі храмы беларускай тэрыторыі колішняй Кіеўскай епархіі ўваходзілі пераважна ў склад Літоўскай епархіі і часткова ў склад Беларускай епархіі [11, с. 107]. У дадзеным артыкуле будуць разглядацца храмы Кіеўскай епархіі не толькі на той час, калі яны ўводзілі ў яе склад, але і пасля яе рэарганізацыі. Акрамя таго, у геаграфічныя межы для разгляду намі будуць уключаны і тэрыторыі Падляшша, якія знаходзяцца ў Польшчы, аднак гістарычна і этнічна звязаны з беларускімі землямі.

Менавіта з апісаннямі цэркваў Кіеўскай епархіі захаваліся найбольш каштоўныя дакументы, складзеныя яшчэ ў да-замойскі перыяд. Так, у візіце за 1680–1682 гг. Мінскай, Лагойскай, Даўгінаўскай, Мядзельскай, Цырынскай, Навагрудскай, Клецкай, Пухавіцкай, Блонскай, Нясвіжскай, Барысаўскай, Баранавіцкай, Бабруйскай пратапопій (да Замойскага Сабора 1720 г. ва ўніяцкім справаводстве выкарыстоўваўся тэрмін "пратапопія" для абазначэння адміністрацыйнай адзінкі, якая складалася з прыхадскіх цэркваў; пазней – з 1720 г. у гэтым жа значэнні выкарыстоўваецца "дэканат") фігуруюць 212 прыхадскіх цэркваў і 104 капліцы [12]. Трэба сказаць, што прычынай праверкі храмаў было выяўленне іх стану пасля вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654 – 1667 гг. А таму выглядае цалкам натуральным, што ў некаторых прыходах царкоўны будынак быў у разбураным стане, альбо дзесьці не мелася начыння. Пры апісанні шэрагу цэркваў іканастасы не згадваюцца. Не вядома, ці іх увогуле не было, што магло быць патлумачана праз заняпад храмаў на працягу ваеннага перыяду, ці яны папросту не адзначаюцца ў дакументах. Паводле нашых падлікаў, больш-менш дакладна



ISSN 2523-4234 Ist. relig. v Ukraini: nauk. schorichn., 2018, Vyp. 28, Ch. II.

можна казаць пра наяўнасць іканастаса ў 64-ох храмах. Пры чым трэба падкрэсліць, што нават не ўсе яны захоўвалі аўтэнтычны выгляд інтэр’ераў. Так, у 11-ці з іх адначасова з іканастасам існавалі ўжо і прысценныя алтары. Найбольш якравымі прыкладамі з’яўляюцца храмы ў паселішчах Дубровы Мінскай пратапопіі, Лагойска (царква Нараджэння Божай Маці) Лагойскай пратапопіі, Спягла Мядзельскай пратапопіі, Беразіно Даўгінаўскай пратапопіі, Бобр Барысаўскай пратапопіі, Беразавец Навагрудскай пратапопіі, Цырын і Сталовічы Цырынскай пратапопіі [12, с. 37, 44–45, 55, 70, 77, 110, 123–124, 127]. Менавіта апісанні гэтых цэркваў не выклікаюць сумневаў, што тут адначасова пры існаванні іканастаса меліся і прысценныя алтары.

Трэба адзначыць, што ў канцы XVII ст. дакладна ў шасці храмах быў лацінскі тып інтэр’ера. Так, у Юраўскай царкве м. Ляхавічы Цырынскай пратапопіі былі галоўны і бакавыя алтары [12, с. 132]. Тое ж датычыцца царквы Сашэсця Св. Духа ў м. Даўгінава Даўгінаўскай пратапопіі [12, с. 62]. У пераважнай жа большасці цэркваў, мяркуючы па апісанні, было толькі па адным алтары: не згадваюцца ні іканастасы, ні бакавыя алтары. Таму не зразумела, ці быў гэта прысценны алтар, усталяваны на ўзор каталіцкіх, ці гэта былі прастолы ў віме, усталяваныя за іканастасамі, якія проста не апісваюцца. Для шэрагу храмаў увогуле толькі адзначаецца, што яны аздоблены абразамі, а ў якіх сакральных канструкцыях яны знаходзіліся (іканастасах ці алтарах) не гаворыцца.

Неабходна таксама сказаць, што ўжо ў гэты час у некаторых храмах была зафіксавана новая з’ява, якая ўзнікла ў рэчышчы грэка-каталіцкай царквы, – мясцовыя алтары. Менавіта гэты тэрмін у XVIII ст. шырока выкарыстоўваўся ў справаводстве ўніяцкай царквы для абазначэння цікавай з’явы, якая сфарміравалася ў рэчышчы разглядаемай канфесіі: пад абразы мясцовага чыну іканастаса падстаўляліся менсы, і гэтыя “комплексы” у літургічным плане маглі выконваць тую ж функцыю, што і звычайныя бакавыя прысценныя алтары.

У дадзенай архіўнай справе такі тэрмін яшчэ не выкарыстоўваўся, аднак з апісання вынікае, што гаворка ідзе менавіта пра іх. Так, у візіце царквы Св. Варвары в. Суляцічы Навагрудскай пратапопіі за 1680-ы г. згадваюцца "namiestne obrazy porządnie ubrane z ołtarzami…[1]" [12, с. 104]. Другі падобны прыклад датычыцца царквы Нараджэння Божай Маці мястэчка Ігумена Ігуменскай пратапопіі (зараз – г. Чэрвень, Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл.) за 1682 г.: "ołtarz przed obrazem namiesnem Naswięszey Panny…" [12, с. 104]. Як бачна з прыведзеных вышэй звестак, у справе за 1680−1682 гг. мясцовыя алтары былі толькі ў двух храмах з двухста апісаных. Аднак з архіўнай справы за 1696 г., дзе ўтрымліваюцца дадзеныя пра іншыя цэрквы Кіеўскай епархіі, вынікае, што ў храме в. Дзераўная Слонімскай пратапопіі ля Царскай Брамы знаходзіўся алтар Маці Божай (пры гэтым у царкве меўся яшчэ і галоўны алтар) [13, л. 1.]. Па ўсёй верагоднасці, тут маецца на ўвазе мясцовы алтар. Такім чынам, у канцы XVII ст. ужо назіраліся тыя праявы, якія ў наступным стагоддзі сталі больш маштабнымі і ўкараніліся ва ўсіх епархіях.

Не гледзячы на тое, што ў шматлікіх апісаннях інтэр'ераў цэркваў Кіеўскай епархіі ў 1680–1682 гг. звесткі прыведзены даволі павярхоўныя, усё ж складваецца ўражанне, што на той час у названым рэгіёне большасць цэркваў ужо была без іканастасаў. У любым выпадку, нават тыя прыклады, якія былі прыведзены вышэй, сведчаць пра працэсы лацінізацыі ва ўніяцкіх храмах названага рэгіёну яшчэ да Замойскага Сабору (1720 г.). Гэта праявілася як у скасаванні іканастасаў у пэўнай частцы храмаў, так і ва ўсталяванні на каталіцкі лад прысценных алтароў. Пры чым бакавыя алтары ў некаторых цэрквах размяшчаліся поруч з іканастасамі, зацвярджаючы гэтым новы, невядомы дагэтуль прынцып арганізацыі сакральнай прасторы храма, што атрымала распаўсюджанне ва ўніяцкіх цэрквах і іншых рэгіёнаў Беларусі і захоўвалася там да 1830-х гадоў.

[1] Тут і далей цытаты з гістарычных дакументаў прыводзяцца з захаваннем арфаграфіі.


ISSN 2523-4234 Ist. relig. v Ukraini: nauk. schorichn., 2018, Vyp. 28, Ch. II.

Далей у гэтым рэгіёне ўсе акрэсленыя тэндэнцыі яшчэ больш развіліся. Аднак гэта адбывалася ў розных мясцовасцях з рознымі тэмпамі і інтэнсіўнасцю. На жаль, дакументаў пачатку XVIII ст. захавалася мала. Адзінкавыя крыніцы таго часу сведчаць, што ў некаторых храмах інтэр’ер працягваў захоўваць свой аўтэнтычны выгляд. У прыватнасці гэта датычыцца царквы Нараджэння Божай Маці г. Рагачова, дзе ў 1715 г. захоўваўся іканастас і меўся ахвярнік. У візіце згадваецца і галоўны алтар, пра які адзначаецца, што ён сталярнай работы і са слупкамі, аднак візітатар так мог апісаць ківот з абразом у віме храма, які яшчэ мог быць усходне-хрысціянскім атрыбутам, а не прыкметай лацінізацыі [14].

У сярэдзіне XVIII ст. карцінка была даволі стракатая. У Пухавіцкім дэканаце ў 1744 г. іканастасы былі ва ўсіх сямі апісаных храмах, праўда ў адным з іх былі яшчэ і мясцовыя алтары, а ў іншым – бакавы. Разам з тым, пяць цэркваў захоўвалі грэчаскі тып інтэр’еру [15]. З 10 звізітаваных у 1744 г. храмаў Рагачоўскага дэканату іканастасы былі ў 9. Хаця трэба адзначыць, што большасць з іх была з мясцовымі алтарамі [15]. Тое ж самае назіралася ў зусім іншым рэгіёне: так, у 1738 г. у Мядзельскім дэканаце з чатырох апісаных храмаў усюды знаходзіўся іканастас, праўда ў трох выпадках разам з ім суіснавалі мясцовыя або бакавыя алтары [16]. Увогуле, у 1730–1740-ых гг. у некаторых цэрквах Лідскага [17], Мінскага, Лагойскага, Ігуменскага, Блонскага [18] дэканатаў захоўваўся бадай “чысты” ўсходні тып інтэр’ера: тут яшчэ не было прысценных алтароў, а меліся толькі іканастасы. Аднак пры гэтым, напрыклад, у іншай палове цэркваў Мінскага дэканату храмавая ўнутраная прастора была накшталт касцёльнай [18]. Тое ж самае датычыцца і Гродзенскага дэканату, дзе большасць цэркваў, па ўсёй верагоднасці, ужо была была аформлена на лацінскі лад[2] [19, с. 232−234]. Існаваў таксама і шэраг іншых варыянтаў афармлення інтэр’ераў, заснаваны на сінтэзе сакральных аб’ектаў з абедзвюх

[2] Аўтар выказвае шчырую падзяку гісторыку Юрыю Мікалаевічу Мікульскаму за прадастаўленне звестак па Гродзенскім дэканаце за 1737 г., якія былі змешчаны ў рукапісе І. Кульчынскага.

традыцый. Так, у Даўгінаўскім дэканаце ў 1739 г. амаль ва ўсіх храмах былі бакавыя алтары, пры гэтым у палове з іх працягвалі захоўвацца іканастасы [20]. Такім чынам, адзінства ў межах епархіі не назіралася.

Аднак у канцы XVIII ст. працэнтныя суадносіны храмаў з іканастасамі і без іх фактычна ва ўсіх частках епархіі змянілася адносна 1730–1740-х гадоў. Напрыклад, за 1732 г. нам вядомы апісанні інтэр’ераў 13 цэркваў (14-ая царква – у Лідзе, згадваецца, аднак няма апісання інтэр’еру) разглядаемай епархіі, размеркаваныя ў Ашмянскім, Лідскім, Мядзельскім і Блонскім дэканатах [17]. З шасці цэркваў Лідскага дэканату іканастасы былі ва ўсіх [17, арк. 6–10]. Наступная паводле храналогіі вядомая нам крыніца з апісаннямі гэтых жа храмаў складзена праз паўстагоддзі – у 1784 г. [21]. У гэты час іканастас працягваў захоўвацца толькі ў адной з іх – у Ракавічах [21, с. 58–59]. Ды і тое тут былі ўжо ў іканастасе ўладкаваны два мясцовыя алтары, якіх на 1732 г. не было. Акрамя іх таксама меліся галоўны і бакавы алтары. А ўвогуле ў Лідскім дэканаце з 15 прыхадскіх цэркваў, апісаных у 1784 г. іканастасы былі ў пяці, а ў 1792 г. – у двух [22]. Гэтыя лічбы даволі красамоўна сведчаць пра тое, як тут праходзіла лацінізацыя. Разам з тым падкрэслім, што ў іншых рэгіёнах сітуацыя магла адрозніваццa і адзін асобна ўзяты дэканат не сведчыць пра сітуацыю па епархіі ў цэлым, а тым больш – пра абстаноўку ва ўніяцкай Царкве ўвогуле па тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.

Даволі добра дынаміку ў гэтым жа рэгіёне можна прасачыць на прыкладзе некалькіх цэркваў Слонімскага дэканата, па якіх захавалася па 15–20 дакументаў амаль за стогадовы прамежак часу: ад 1730-х да 1820-х. З апісання востраўскай царквы за 1733 г. вынікае, што там у гэты час іканастаса ўжо не было, пра што і быў зроблены адпаведны запіс: “deysusa niema tylko obrazow kilka na scienie” [23, арк. 1]. Пры чым гэта адзіная крыніца па дадзенай царкве, сярод усіх нам вядомых, дзе такі запіс наўмысна быў зроблены, у больш позніх дакументах іканастас па просту не згадваецца [24]. Тое ж, да

прыкладу, тычыцца і іншай царквы таго ж Слонімскага дэканату – у в. Дзярэчын, па якой нам удалося адшукаць комплекс дакументаў XVIII ст., сярод якіх найбольш ранні за 1739 г. Там адзначаецца, што "deysusu niema tylko obrazow wisza po scianach kilki piękne" [25, арк. 1]. Падобны запіс прысутнічае ў пратаколе наступнай праверкі (1745 г.) па гэтай жа царкве [26, арк. 1]. А вось у больш позніх крыніцах па дзярэчынскім храме згадак пра іканастас (нават пра яго адсутнасць) няма [27]. Гэта, відавочна, тлумачыцца тым, што лацінскі спосаб уладкавання інтэр'еру ўніяцкай царквы ў сярэдзіне XVIII ст. стаў звыклай з'явай. Такім чынам, гэтыя звесткі гавораць пра тое, што "памяць пра іканастасы" ва ўніяцкіх цэрквах у візітатараў, прынамсі гэтага рэгіёну, захоўвалася да 1740-х, а з другой паловы XVIII ст. яго адсутнасць ужо не выклікала здзіўлення і ў дакументах не фіксавалася.

Дарэчы цікава, што яшчэ ў візіце Навагрудскага дэканата за 1754 г. візітатар таксама старанна адзначаў наяўнасць або адсутнасць іканастаса [28]. А вось ва ўсіх іншых вядомых нам крыніцах пры адсутнасці іканастаса яго папросту не згадвалі, а апісвалі тое, што было ў храме. А былі там, як правіла, галоўны і два бакавыя прысценныя алтары, хаця апошніх магла быць і іншая колькасць. Увогуле, у дадзенай епархіі на канец XVIII – пачатак XIX ст. у большасці цэркваў інтэр'ер быў лацінскі. А ў некаторых дэканатах на той час увогуле магло не быць ніводнага храма з іканастасам.

Напрыклад, у Вілейскім дэканаце на 1799 г. толькі ў Троіцкай царкве мястэчка Маркаў захоўваўся напамін пра колішні іканастас – Царская Брама [29]. У іншых дэканатах Кіеўскай епархіі таксама назіралася падобная сітуацыя. Так, у апошняй трэці XVIII ст. у Лідскім, Слонімскім [21], Цырынскім [30], Мінскім [31] і Ігуменскім [32] дэканатах толькі адзінкавыя храмы захоўвалі іканастасы, ды і тое адначасова з імі існавалі прысценныя алтары. А пры гэтым, напрыклад, у Блонскім дэканаце каля 15% прыхадскіх цэркваў (філіяльныя капліцы не ўлічаны, так як яны нават пры абсталяванні паводле ўсходняга абраду маглі быць без іканастаса, бо

ў іх не праводзілася літургія, для правядзення якой ён і з'яўляецца неабходным атрыбутам) былі з іканастасамі [33], у 1784 г. у Нясвіжскім – 15%, Клецкім – 50%. [34], у Падляшскім дэканаце ў 1773 г. – 20% [35], у Бельскім у 1780 – 1790-ыя гг. – каля 30% [36], у Пухавіцкім – 50% у 1774 г. [37] і 35% у 1784 г. [33].

Аднак на момант скасавання Уніі храмы былой Кіеўскай епархіі пераважна ўсе былі абсталяваны на лацінскі лад і мелі па некалькі прысценных алтароў. У некаторых дэканатах на гэты час іканастасаў зусім не было. Гэта датычыцца Гродзенскага дэканата (звесткі за 1814 і 1818 гг.) [38, 39], Мінскага за 1819 г. [40], Барысаўскага і Докшыцка-Барысаўскага за 1830 г. [41]. У Бабруйскім [42], Забярэзінска-Барысаўскім [43], Ігуменскім [44] дэканатах у 1820-ыя гг. толькі ў адзінкавых цэрквах адначасова з прысценнымі алтарамі суіснавалі іканастасы. Аднак неабходна падкрэсліць, што ў той час такая сітуацыя назіралася не ўсюды. Напрыклад, у Рагачоўскім і Гомельскім дэканатах (з 1797 г. увайшлі ў склад Полацкай епархіі) у 1822 г. у пераважнай большасці цэркваў іканастасы былі [45].

Такім чынам, адзінства ў гэтым пытанні не назіралася ні на водным з перыядаў: ні да Замойскага Сабору, ні пасля яго, ні пасля ўваходу нашых земляў у склад Расійскай імперыі. З прыведзеных лічбаў бачна, што нават у межах адной епархіі інтэр'еры храмаў былі абсталяваны па-рознаму. У некаторых дэканатах цэркваў з іканастасамі не было ўвогуле, а ў іншых – такіх была большасць ажно да часу скасавання Уніі.

Вельмі красамоўным прыкладам, які дае магчымасць высветліць пэўныя прычыны зменаў у інтэр'ерах, з'яўляецца гісторыя царквы Св. Мікалая в. Паўлавічы Бабруйскага павета Мінскай губерні [46]. З апісаннем храма нам вядомыя крыніцы з 1719 па 1847 г. Яны дазваляюць прасачыць, як адбываліся змены ў царкве ў часы Уніі і нават пасля яе скасавання і пераводу царквы ў праваслаўе. Найбольш ранні з гэтых дакументаў – адна з нешматлікіх візіт дазамойскага перыяду. З дакумента 1719 г. вынікае, што ў паўлавіцкай

царкве ў той час знаходзіўся двух'ярусны іканастас, а за ім у віме алтар [46, арк. 1а]. Пад паняццем "алтар" у крыніцы мог фігураваць не прысценны алтар "каталіцкага" кшталту, а звычайны прастол для набажэнства па ўсходнім абрадзе. У гэтым храме такі выгляд інтэр'ера захоўваўся даволі доўга: апошні раз ён зафіксаваны ў візіце 1781 г. [46, арк. 1, 3], а вось ужо ў наступным акце агляду за 1784 г. адзначаецца наяўнасць менсаў пад мясцовымі абразамі іканастаса [46, арк. 5]. Пад час наступнай праверкі ў 1792 г. была адзначана яшчэ адна змена: у царкве на той час знаходзіўся яшчэ (акрамя галоўнага ў віме, іканастаса з мясцовымі алтарамі) і бакавы прысценны алтар [46, арк. 9].

У такім выглядзе храм праіснаваў не доўга, бо ў 1797 г. яго знішчыў пажар [46, арк. 11]. Пасля трагічнага здарэння на месцы колішняй царквы была пастаўлена капліца, якая згадваецца ў дакуменце за 1800 г. [46, арк. 12]. А ўжо на час правядзення праверкі 1807 г. была збудавана новая царква, праўда яна яшчэ не мела ўнутраных аздобаў [46, арк. 14]. Яны з'явіліся крыху пазней, і ўжо былі занатаваны пад час праверкі 1812 г. На той час у храме быў галоўны і два бакавыя прысценныя алтары. Тады ж з'явіўся ў царкве і фератрон [46, арк. 16 адв.]. У такім выглядзе храм прастаяў да 1830-х гадоў, пакуль не пачалася падрыхтоўка да скасавання Уніі. Вядома, што ўжо ў 1836 г. у царкве быў іканастас, праўда ў той год пра яго звесткі не прыводзяцца [46, арк. 40]. Аднак ён быў апісаны пазней – у дакуменце за 1845 г., калі ўжо царква функцыянавала як праваслаўная.

Паколькі гэтыя звесткі даюць уяўленне пра тагачасныя іканастасы, якія масава і на хуткую руку майстраваліся ва ўніяцкіх цэрквах у 1830-ыя гг. і адлюстроўваюць асаблівасці ўніяцкіх інтэр'ераў у апошнія гады існавання канфесіі, то прывядзём тут разгорнутую цытату: "Внутри церковь раскрашена в половину на оптику. Иконостас в ней терпит по необходимости. Он устроен из простых досок, окрашенных под покост. На нём изображения наместных икон Спасителя и Богоматери, написаны, как видно,

довремени: потому что небрежно написаны. Царские Врата в решётке с вырезкою, раскрашены под покост золотом. На них изображения четырёх Евангелистов, живописи такой же, как и наместные иконы. На северных и южных вратах изображение: Первомученика Архидиакона Стефана и Архистратига Михаила, живописи такой же, как и выше сказанные. На правой стороне церкви икона храмовая древней рукописи, ветхая. Иконостас сей устроен иждивением и старанием священника Леонтия Якубовича, фундаторы же Павловицкой церкви, как объяснил Священник Леонтий Якубович, ничего об устройстве иконостаса не позаботились” [46, арк. 43].

Гісторыя паўлавіцкай царквы вельмі красамоўная і, верагодна, даволі тыповая. Паказальна, што іканастас захоўваўся доўгі час і наўмысна яго ніхто не разбураў. Інтэр’ер быў сфарміраваны на новы лад ужо ў новым, узведзеным пасля пажару, будынку. Гэтая акалічнасць дазваляе выказаць пэўныя думкі адносна прычын, якія ўплывалі на змену інтэр’ера. Так, усталяваць прысценныя алтары было значна прасцей і танней, чым змайстраваць іканастас. Ва ўмовах адсутнасці строгай кананічнасці, якая ўжо на той час панавала ва Уніяцтве, святары, якія дбалі пра абсталяванне царквы, абіралі больш зручны і бюджэтны варыянт. У тыя часы пажары здараліся вельмі часта, шматлікія храмы разбураліся і пад час бясконцых войнаў, таму, верагодна, змены ў інтэр’ерах і іншых цэркваў былі выкліканы не тым, што святары наўмысна прыбіралі іканастасы і імкнуўся надаць царкве “касцёльны” выгляд, а тым, што гэта было абумоўлена эканамічнымі фактарамі. Верагодна, што і знікненне іканастасаў у значнай частцы храмаў разглядаемай епархіі яшчэ да 1680-х гг., тлумачыцца гэтымі ж акалічнасцямі, бо не задоўга да правядзення праверкі толькі завяршылася зацяжная вайна з Маскоўскай дзяржавай.

Аднак неабходна падкрэсліць, што наяўнасць іканастаса ва ўніяцкім храме далёка не заўсёды тлумачыцца тым, што ён, як рудымент, захаваўся з часоў праваслаўнай мінуўшчыны пэўнага

царкоўнага будынку. Безумоўна, у шматлікіх візітацыйных актах па храмах розных рэгіёнаў ён апісваецца як “stary” або “staroswiecki”, аднак нават у сярэдзіне і канцы XVIII ст. часам “dejsus” фігуруе ў дакументах з характарыстыкай “новы”. Напрыклад, у карэліцкай царкве Нараджэння Маці Божай і Апосталаў Пятра і Паўла ў 1754 г. іканастас апісаны наступным чынам: “Deisus nowy niemalowany. Carskie drwi snicerskiey roboty nowe niemalowane” [28, арк. 29 адв.]. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў значнай колькасці цэркваў гэтага ж Навагрудскага дэканату іканастасы згадваюцца як старыя.

У некаторых цэрквах абодва тыпы сакральных канструкцый – іканастас і бакавыя алтары – усталёўваліся адначасова. Красамоўным тут з’яўляецца прыклад з царквой у мястэчку Зембін Лагойскага дэканату ў 1763 г.: “…na dwa ołtarze poboczne na dwie kondygnacy niestawione ieszcze tylo zrobiono snicerskiey roboty, oraz na Carskie Drzwi y Dejsus także iest materia zgotowano snicerskiey roboty, tylo niestawione…” [47, арк. 9]. На момант візітацыі ў належным выглядзе знаходзіўся толькі галоўны алтар, размешчаны, верагодна, у віме.

У Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве захоўваецца кантракт, заключаны ў 1783 г. з іканапісцам Рыгорам Мядзведскім на напісанне абразоў для новага іканастаса журавіцкай царквы Рагачоўскага дэканату [48]. Гэта таксама з’яўляецца сведчаннем таго, што на грэчаскі лад храмавыя інтэр’еры працягвалі ўладкоўвацца і ў 80-ыя гг. XVIII ст.

Таксама ў дакументах другой паловы XVIII ст. часам утрымліваюцца звесткі пра тое, што іканастас яшчэ не скончаны або толькі пачаты. Так, у пратаколе праверкі 1764 г. свенцкай царквы Рагачоўскага дэканату прысутнічае такое апісанне “Deisus snicerskiey roboty niedokączżony” [49, арк. 47]. Аналагічныя звесткі маюцца і ў больш позніх дакументах. Так, у Троіцкай царкве в. Заспа Глускага дэканату ў 1792 г. “Konostas z Carskiemi Drzwiami pod złotem malarskim niedokonczony” [50, арк. 5].

Усе гэтыя прыклады сведчаць пра тое, што практыка ўсталявання іканастасаў працягвалася, нават не гледзячы на тое, што і лацінскія традыцыі даволі трывала ўкараніліся.

Цікавай у гэтым рэчышчы з'яўляецца крыніца за 1837 г. [51], дзе прыведзены сістэматызаваныя звесткі пра ход пераабсталявання інтэр'ераў цэркваў Літоўскай епархіі, у склад якой уваходзілі на той час прыходы былой Кіеўскай мітрапаліцкай епархіі. Напярэдадні складання гэтай справы ўніяцкія храмы атрымалі распраджэнні пра прывядзенне інтэр'ераў у той выгляд, які адпавядае правілам ўсходнехрысціянскага абраду: усюды мусілі быць усталяваны іканастасы і дэманціраваны бакавыя алтары (а таксама арганы, амбоны, дзе яны былі). Усе пераўтварэнні мусілі завяршыцца ў 1836 г., і ў 1837 г. быў складзены ў выглядзе табліц зводны дакумент. Іканастасам там прысвечаны тры графы, дзе для кожнага з храмаў у неабходнай быў зроблены запіс: “существовал издревле”, “устроен в последние годы”, “ещё не имеется”. Нас у дадзеным выпадку найбольш цікавіць першы з варыянтаў, бо дае ўяўленне пра тое, у якіх цэрквах іканастасы існавалі на працягу ўсяго (ці можа быць калісьці знікалі, але пасля зноў з'яўляліся) перыяду Уніі.

Так, з названай крыніцы вынікае наступнае: у Дагічынскім дэканаце з 35-ці цэркваў (34 прыхадскія і 1 прыпісная) спрадвеку іканастасы былі ў пяці, у Гродзенскім з 27-мі – у адной, у Навагрудскім з 62-ух (50 прыхадскіх + 12 прыпісных) – у чатырох, у Слонімскім з 38-мі ў – ніводнай, у Лідскім з 25-ці (24 прыхадскія + 1 прыпісная) – у адной, у Ваўкавыскім з 27-мі – у адной, у Вілейскім з 42-юх (39 прыхадскіх + 3 прыпісныя) – у ніводнай, у Слуцкім з 33-ох – у ніводнай, у Бельскім з 35-ці (32 прыхадскія + 3 прыпісныя) – у пяці, у Беластоцкім з 17-ці – у ніводнай, у Ашмянскім з 31-ой – у ніводнай, у Мінскім з 43-ох (37 прыхадскіх + 6 прыпісных) – у ніводнай. Такім чынам, з прадстаўленых у справе звестак па 415-ці храмах (капліцы мы тут не ўлічвалі) былой Кіеўскай епархіі (частка епархіі пасля

пераўтварэнняў у перыяд Расійскай імперыі ўвайшла ў склад Полацкай епархіі) іканастасы здаўна захоўваліся і дайшлі да перыяду скасавання Уніі ў 17-ці, што складае 4%. Па тых дэканатах, якія адыйшлі да Полацкай епархіі, такія звесткі ў аналагічным выглядзе нам выявіць не ўдалося, аднак з апісанняў храмаў 1820-х гг. Барысаўскага, Гомельскага, Рагачоўскага, Ігуменскага дэканатаў (пра якія было згадана вышэй) вынікае, што і там іканастасаў на той час амаль не заставалася.

За тое пра бакавыя алтары ў сістэматызаваный табліцы па Літоўскай епархіі адзначаецца ці яны дэманціраваны, ці іх увогуле не было. А не было іх з 415 цэркваў толькі ў пяці. Гэтыя лічбы вельмі красамоўна сведчаць пра паступовую трансфармацыю інтэр’ераў уніяцкіх цэркваў ад усходнехрысціянскага тыпу да заходнехрысціянскага. Праўда адзначым, што ў іншых грэка-каталіцкіх епархіях сітуацыя адрознівалася.

Такім чынам, на беларускай тэрыторыі ва ўніяцкіх храмах Кіеўскай епархіі змены ў інтэр’ерах пачалі назірацца яшчэ да Замойскага сабору, якому звычайна прыпісваецца роля ў лацінізацыі ўніяцкай царквы. Ужо на канец XVII ст. у цэрквах адначасова пры захаванні іканастасаў існавалі бакавыя і мясцовыя алтары, у некаторых выпадках іканастасаў увогуле не было. Аднак пры гэтым меліся і цэрквы, дзе іканастасы існавалі на працягу ўсяго перыяду Уніі. Натуральна, што яны таксама зазналі ўплывы лацінізацыі, што праявілася ў з’яўленні бакавых алтароў. Пра прычыны гэтых працэсаў і пра схільнасці той ці іншай царквы да пэўнага варыянту абсталявання можна толькі здагадвацца.

Бакавыя алтары пры захоўванні іканастасаў маглі пачаць з’яўляцца праз фундатараў-каталікоў. Так, у каталіцкай традыцыі пашыранай з’явай было тое, што вернікі ахвяравалі для касцёлаў алтары ў гонар сваіх нябесных патронаў. Тое ж самае яны, верагодна, пачалі практыкаваць і ва ўніяцкіх цэрквах. А таму і атрымлівалася, што пры наяўнасці іканастаса маглі ўзнікнуць і атрыбуты “лацінства”.



ISSN 2523-4234 Історія релігій в Україні: наук. щорічн., 2018, Вип. 28, Ч. II.

Адным з фактараў, які, на нашую думку, паўплываў на поўны пераход да лацінскага тыпу, з'яўляецца энамічны: так, пасля адбудовы разбуранай царквы, што ў тыя часы адбывалася часта з-за войнаў і пажараў, прасцей і танней было ўладкаваць прысценны алтар, чым іканастас, бо на яго не патрабавалася такой колькасці ікон, а мянавіты яна каштавалі дорага. Яшчэ адным фактарам, які мог мець значэнне ў гэтым пытанні, з'яўляецца наяўнасць або адсутнасць у пэўнай мясцовасці каталіцкіх кляштараў. Яны калі не на прамую, дык ускосна маглі задаваць "моду", якая запазычвалася і прыхадскімі ўніяцкімі цэрквамі.

Нельга выключаць і ролю калятараў – апекуноў царквы. Так, нам вядомы адзін пісьмова занатаваны выпадак, калі пад час праверкі 1779 г. тапалянскай царквы Падляшскага дэканату візітатар адзначыў адсутнасць Царскай Брамы (яна там знаходзілася пад час папярэдняй праверкі ў 1773 г.) і выказаў неразуменне гэтай сітуацыі, бо сам ён такіх распараджэнняў пад час папярэдняга візіту не даваў: "Carskie drzwi wynacił niewiedzieć z iakiey okolicznosci czyli porady Dworney" [35, арк. 40]. У дадзеным выпадку дэкан гаворыць пра верагодны ўплыў двору, г. зн. – калятараў. Такім чынам, мы маем пэўны прыклад лацінізацыі пад уплывам калятараў. Не вядома, ці было гэта масавай з'явай, аднак нельга выключаць тое, што на скасаванне іканастасаў маглі ўплываць уласнікі той зямлі, дзе стаяў уніяцкі храм.

1. Ярашэвіч А. А. Уступ // Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў: віртуальная версія выставы "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў" у Нацыянальным мастацкім музеі 23 лютага – 10 чэрвеня 2009 г. Мінск: Нацыянальны мастацкі музей, 2009.

2. Сиговский П. Несколько замечаний о внутреннем убранстве церквей Брестского оффициалитата униатской Владимиро-Брестской епархии Киевской митрополии в свете визитации 1725–1727 гг.: иконостасы, "московские" и другие иконы // X Филевские чтения: тез. конф. (Москва, 14–16 декабря 2010 г.). Москва, 2010. С. 62–65.

3. Sygowski P. Dekanat hołubicki unickiej diecezji "polskopołockiej" w 1789 r. // Dziedzictwo unii brzeskiej. Lublin−Supraśl, 2012. S. 243–268.

4. Флікоп-Світа Г. А. Асаблівасці размяшчэння алтароў у інтэр'ерах грэка-каталіцкіх храмаў Полацкай епархіі ў XVII – пачатку XIX стст. // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов: сб. ст. респ. науч.-практ. семинара (Новополоцк, 8-9 окт. 2015). Новополоцк: ПГУ, 2015. С. 100–107.

5. Флікоп Г. А. Іканастасы ўніяцкіх храмаў Тураўскай епархіі ў 1770–1780-я гады: наяўнасць і канструкцыя // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. Мінск: Права і эканоміка, 2012. Вып. 12. С. 588–593.

6. Флікоп Г. А. Творы іканапісу ва ўніяцкіх храмах Брэсцкага дэканату 2-й паловы XVIII ст.: на матэрыяле пратаколаў візітацый // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. Мінск: Права і эканоміка, 2011. Вып. 11. С. 590–602.

7. Флікоп Г. А. Іканастасы ў грэка-каталіцкіх храмах Уладаўскага дэканату ў сярэдзіне XVIII ст.: паводле візіты 1759 г. // Історія релігій в Україні: наук. щорічн. Львів: Інститут релігієзнавства, 2012. Кн. 2, част. 2. С. 471–483.

8. Флікоп Г. А. Іканастасы ва ўніяцкіх храмах Палескага дэканату ў др. пал. XVIII – 30-х гг. XIX стст. // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. Гродно: ГрГУ, 2012. С. 210–214.

9. Флікоп Г. А. Размяшчэнне абразоў у інтэр'ерах уніяцкіх храмаў Кобрынскага дэканату ў др. пал. XVIII ст.: на матэрыяле архіўных крыніц // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 10-11 лістап. 2011 г.). Мінск: Права і эканоміка, 2011. С. 87–92.

10. Флікоп Г. А. Існаванне іканастасаў у грэка-каталіцкай царкве ў XVII – першай палове XIX ст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Мінск: Беларуская навука, 2013. № 4. С. 81–87. (Серыя гуманітарных навук).

11. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і ін. Мінск: БелЭн, 2001. 368 с.

12. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зб. дак. / уклад. Д. В. Лісейчыкаў. Мінск: І. П. Логвінаў, 2009. 270 с.: іл.

13. Візіты цэркваў Слонімскай, Клецкай, Нясвіжскай, Гродзенскай, Цырынскай, Ваўкавыскай пратапопій, 1696 // Российский государственный исторический архив (далей – РГИА). Ф. 823. Оп. 3. Д. 420.

14. Візіта Рагачоўскай царквы, 1715 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 496.

15. Візіты Блонскага, Пухавіцкага, Рагачоўскага дэканатаў, 1744 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 541.

16. Візіты цэркваў Ашмянскага павета Мядзельскага дэканата, 1738 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 531.

17. Візіты цэркваў Лідскага і Ашмянскага дэканатаў, 1732 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 518.

18. Візіты цэркваў Лагойскага, Мінскага, Ігуменскага, Блонскага дэканатаў, 1743 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 539.

19. Новонайденные рукописи Игнатия Кульчинского 1736–1738 гг. со сведениями по церковной истории Гродно и окрестностей / падрыхт. Ю. М. Мікульскі // Беларуская даўніна. Мінск, 2016. Вып. 3. С. 220–254.

20. Візіты цэркваў Даўгінаўскага дэканата, 1739 // РГИА. Ф. 823. Оп. 3. Д. 534.

21. Візіты цэркваў Слонімскага і Лідскага дэканатаў, 1784 // Lietuvos valstybes istorijos archyvas (далей – LVIA). Ф. 634. Воп. 1. Спр. 53.

22. Візіты цэркваў Лідскага, Мазырскага, Рэчыцкага дэканатаў, 1792−1803 // Нацыянальны гістарычны музей Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41244.

23. Візіта Астроўскай царквы Слонімскага дэканата, 1733 // Vilniaus universiteto biblioteka. Аддзел рукапісаў (далей – VUB. AP.). Ф. 17. Спр. 14416.

24. Візіты Астроўскай царквы Слонімскага дэканата, 1743–1787 // VUB. AP. Ф. 4. Спр. 14417–14432, 14436, 14443.

25. Візіта Дзярэчынскай царквы Слонімскага дэканата, 1739 // VUB. AP. Ф. 4. Спр. 1485.

26. Візіты Дзярэчынскай царквы Слонімскага дэканата, 1745 // VUB. AP. Ф. 4. Спр. 1486, 1487.

27. Візіта Дзярэчынскай царквы Слонімскага дэканата, 1748, 1764, 1768, 1769, 1784 // VUB. AP. Ф. 4. Спр. 1488–1492.

28. Візіты Навагрудскага дэканата, 1754 // НГАБ. Ф. 1502. Воп. 1. Спр. 13.

29. Візіты цэркваў Вілейскага павета 1784–1827 // Lietuvos mokslu akademijos biblioteka (далей – LMAB), AP. Ф. 41. Спр. 107−212.

30. Візіты Цырынскага дэканата, 1793 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41248.

31. Візіты Мінскага дэканата, 1779 // LVIA. Ф. 634. Воп. 3. Спр. 400.

32. Візіты Ігуменскага дэканата, 1792 // НГАБ. Ф. 1655. Воп. 1. Спр. 2.

33. Візіты Пухавіцкага і Блонскага дэканатаў, 1783 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41285.

34. Візіты Клецкага і Нясвіжскага дэканатаў, 1784 // НГАБ. Ф. 3245. Воп. 7. Спр. 3.

35. Візіты Падляшскага дэканату, 1773 // LMAB. F17. 155.

36. Візіты Бельскага дэканату, 1784 // LVIA. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 51.

37. Візіты Пухавіцкага і Ігуменскага дэканатаў, 1774 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41239.

38. Візіты Гродзенска дэканату, 1814 // LMAB. РА. Ф. 17. Спр. 158.

39. Візіты Гродзенска дэканату, 1818 // LMAB. РА. Ф. 17. Спр. 159.

40. Візіты Мінскага дэканата, 1819 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41256.

41. Візіты Барысаўскага і Докшыцка-Барысаўскага дэканатаў, 1830 // НГАБ. Ф. 3245. Воп. 3. Спр. 65.

42. Візіты Бабруйскага дэканату, 1828 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41265.

43. Візіты Забярэзінска-Барысаўскага дэканату, 1825 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41264.

44. Візіты Ігуменскага дэканату, 1823 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41262.

45. Візіты Рагачоўскага і Гомельскага дэканатаў, 1822 // РГИА. Ф. 824. Воп. 2. Спр. 184.

46. Візіты царквы Св. Мікалая в. Паўлавічы Бабруйскага павета Мінскай губерні, 1719–1847 // НГАБ. Ф. 763. Воп. 1. Спр. 1.

47. Візіты Лагойскага і Мядзельскага дэканатаў, 1763 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41235.

48. Документы о приглашении мастера живописного искусства к росписи иконостасов солтанской и журовицкой церквей, 1779−1783 // РГИА. Ф. 823. Оп. 2. Д. 2292.

49. Візіты Рагачоўскага дэканату, 1764 // НГАБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41278.

50. Візіты Глускага дэканату, 1792 // НГАБ. Ф. 1299. Воп. 1. Спр. 1.

51. Ведомости о внутреннем устройстве церквей Литовской епархии, 1837 // LVIA. Ф. 634. Воп. 1. Спр. 4.